**Л. В. Ветрава**
Брэст, Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт

## АДМЕТНАСЦІ ЎЖЫВАННЯ КАЛАРОНІМАЎ У ТВОРЧАСЦІ ЯНКІ КУПАЛЫ

Янка Купала – класік сусветнай беларускай літаратуры, адзін з заснавальнікаў новай беларускай літаратуры і сучаснай беларускай літаратурнай мовы, народны паэт Беларусі, духоўны лідар беларускага нацыянальнага адраджэння. У 1910–1913 гг. была створана паэма "Яна і я", рамантычныя паэмы на фальклорнай аснове "Курган", "Бандароўна",

"Магіла льва", у якіх Купала выявіў сябе найбуйнейшым прадстаўнікoм нацыянальнага рамантызму.

Рамантычныя паэмы Купалы перапоўненыя каларыстычнай лексікай, напрыклад: Белы хорам [1, с. 361], залатая натура [1, с. 246], залатыя зоры [1, с. 356], зялёны луг [2, с. 377], сіняе неба [2, с. 268], чырвоная раса [2, с. 380] і інш.

Каларонімы – словы са значэннем колеру. Каларонімы валодаюць істотным сімвалічным патэнцыялам: адыгрываюць значную ролю ў выяўленні аўтарскай задумы і забеспячэнні своеасаблівага эстэтычнага дыялогу паміж пісьменнікам і чытачом. Ва ўяўленні беларусаў кожны колер меў пэўнае значэнне. Гэта адлюстроўваецца ў параўнаннях, якія ўжываюцца ў рамантычнай паэме:

Як маліны, яе губкі,
А твар, як лілея (Я. Купала. Бандароўна) [4].

Пераважную большасць параўнанняў складаюць вобразныя адзінкі, якія свежа і арыгінальна апісваюць пачуцці лірычнага героя, перадаюць адметнасць аўтарскага светаўспрымання.

Эпітэт – від тропа, мастацкае азначэнне, якое вобразна, эмацыянальна характарызуе чалавека, прадмет, жыццёвыя з'явы, падзеі. Эпітэты дапамагаюць пісьменнікам адлюстраваць свае пачуцці і перажыванні, выявіць адносіны да навакольнага свету. У ролі эпітэтаў часцей за ўсё выкарыстоўваюцца прыметнікі, дзеепрыметнікі і назоўнікі:

І мнагацветныя акружаць нас вясёлкі,
Маланкі *залатыя* замігцяць,
А думкі нашы, верныя саколкі,
Да неба з добрай весткай паляцяць
(Я. Купала. Яна і я) [1, с. 364].

Вылучаюць эпітэты сталыя, альбо фальклорныя (ясная зорка, цёмная ночка, белыя ручайкі), і нясталыя, або індывідуальна-аўтарскія, якія ўласцівы творчай манеры асобных пісьменнікаў. Эпітэт канкрэтызуе намінатыўнае значэнне таго ці іншага прадмета, засяроджвае ўвагу на яго колеравым або гукавым фоне, стварае непаўторныя мастацкія вобразы. Найбольш старажытнымі паводле паходжання з'яўляюцца таўталагічныя эпітэты. Яны стварылі непаўторнасць агульнафальклорнай плыні ў паэме "Яна і я" Я. Купалы. Даволі частыя ў Я. Купалы ўстойлівыя стылістычныя формулы, што складаюцца са сталых эпітэтаў і пэўных дзеясловаў ці з некалькіх сталых эпітэтаў:

Вам, людзі, што сваёй рукою *белай*
Зямлі не кратаеце сэрца,
Не дагадацца цераз век свой цэлы,
Як сэрца чалавека б'ецца (Я. Купала. Яна і я) [1, с. 370].

Метафара ў Я. Купалы звязана з пазнавальнай дзейнасцю чалавека і грунтуецца на адным з самых універсальных сродкаў чалавечага ўсведамлення – параўнанні, супастаўленні новага прадмета з ужо вядомым і выдзяленні пры гэтым іх агульных уласцівасцей:

Залатыя завушніцы;
Залатыя снапкі;
*Срэбраныя* кроплі;
Срэбраныя завушніцы (Я. Купала. Яна і я) [1, с. 372].

Метафара мае некалькі разнавіднасцяў. Найбольш пашыраны від мастацтва – адухаўленне, наданне нежывым прадметам, з'явам прыроды ўласцівасцяў жывых істот. Вось як паэт падае метафару ў сваёй паэме "Курган":

Раз бяседа вялікая ў князя была:
На пасад дачку княжну садзілі;
За сталом він заморскіх крыніца *цякла*,
*Бегла* музыка ўкруг на паўмілі
(Я. Купала. Курган) [2, с. 358].

Персаніфікацыя – наданне нежывым прадметам, з'явам прыроды ўласцівасцяў чалавека. Прыём персаніфікацыі шырока выкарыстоўваецца ў фальклорных творах (казках, легендах, паданнях, байках), а таксама творах мастацкай літаратуры:

Краскамі ўсміхаецца ўся сенажаць,
Гарацць урочнікі, румянкі і званкі,
Жоўтыя званцы зялёны луг жаўцяць,
На кветку з кветкі шыбка скачуць матылькі
(Я. Купала. Яна і я) [1, с. 376].

У паэме Я. Купалы "Бандароўна" часта выкарыстоўваецца сцягнутая форма прыметнікаў з мэтай стылізацыі іх пад народныя песні:

Уцякала Бандароўна
У поле з цёплай хаты,
Абдымала яе ночка,
А вецер крылаты
Расплятаў ёй косы *буйны*,
Песціў *белы* грудзі;
Болей жалю меў над ёю,
Як якія людзі Я. Купала (Я. Купала. Бандароўна) [4].

Такім чынам, каларонімы з'яўляюцца часткай творчасці Я. Купалы. У рамантычных паэмах сустракаюцца такія колеры, як чорны (7), жоўты (залаты) (13), сіні (4), чырвоны (8), белы (34), зялёны (3), шэры (2).

У рамантычных паэмах Я. Купалы каларонімамі выступаюць назоўнікі (44), прыметнікі (34), дзеясловы (13). Назоўнікі знаходзяцца на першым месцы сярод іншых часцін мовы, бо ў іх закладзена не толькі абазначэнне рэалій ці рыс характару, але і ёсць пэўнае ўказанне на спецыфічную ролю, функцыю часціны мовы: унутры значэння знаходзяцца адпаведныя характарыстыкі (кроў, золата, агонь, зара, жар). На другім месцы знаходзіцца прыметнік, які, як вядома, абазначае прымету прадмета, таму яго галоўнай функцыяй з'яўляецца дасягненне вобразнасці. Дзеяслоў выкарыстоўваецца значна радзей у параўнанні з назоўнікам і прыметнікам. Ён абазначае рухі, дзеянні, выражае розныя эмоцыі і інш. (задымець, гарыць, чарнець, іскрыцца, збялець).

Прыметнікі ўжываюцца ва ўсіх стылях мовы, але функцыі іх розныя.

Даследаванне ролі каларыстычнай лексікі ў рамантычных паэмах Янкі Купалы – вельмі цікавы працэс, з дапамогай якога можна ўбачыць, раскрыць сутнасць аўтарскага слова, дакладнасць выказанай думкі.

**Спіс выкарыстанай літаратуры**

1. Бабіч, Ю. Моўная гульня ў загалоўку сучаснага публіцыстычнага тэксту / Ю. Бабіч // Род. слова. – 2007. – № 3. – С. 33–36.

2. Купала, Я. Збор твораў. Вершы і паэмы 1908–1910 гг. : у 6 т. / Я. Купала. – Мінск : Выд-ва АН БССР, 1961. – Т. 2. – С. 344–364.

3. Купала, Я. Збор твораў. Вершы і паэмы 1908–1910 гг. : у 6 т. / Я. Купала. – Мінск : Выд-ва АН БССР, 1961. – Т. 3. – С. 344–381.

4. Купала, Я. Бандароўна [Электронны рэсурс] / Я. Купала. – Рэжым доступу: https://knihi.com/Janka_Kupala/Bandarouna_9t.html. – Дата доступу: 16.05.2022.